УДК 94(476)

# ДЗЕЙНАСЦЬ КАМСАМОЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАГА ПАТРЫЯТЫЧНАГА ПАДПОЛЛЯ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**І. А. Саракавік**
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь
г. Мінск, Беларусь

Беларусь першай з савецкіх рэспублік сустрэла нападзенне фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз, армія якой была адмабілізаванай і мела практыку ваенных дзеянняў у Еўропе. І хоць вайну з боку Германіі савецкі ўрад чакаў і ўсё прадпрымаў дзеля таго, каб не дапусціць яе, пераводзіў эканоміку на ваенны лад, але нападзенне фашысцкіх захопнікаў для многіх аказалася вераломным. Стойкасць і мужнасць пагранічнікаў, абаронцаў Брэсцкай крэпасці, Брэсцкага чыгуначнага вакзала з першых дзён вайны сталі нечаканымі для вермахта, затрымалі іх імклівае прасоўванне на Маскву. Дастаткова адзначыць, што немцы былі пад Смаленскам, а Брэсцкая крэпасць яшчэ змагалася. У яе шарэнгах знаходзіліся ў асноўным маладыя людзі, камсамольцы. І яны з гонарам выконвалі свой абавязак перад Радзімай.

Тым не менш, на пачатак восені 1941 г. фашысцкая армада змагла акупіраваць усю тэрыторыю Беларусі. З першых дзён вайны партыйна-савецка-камсамольскае кіраўніцтва рэспублікі прымала аператыўныя рашэнні па мабілізацыі народа на барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яшчэ немцы не захапілі ўсю тэрыторыю БССР, як 30 чэрвеня 1941 г. бюро ЦК КП(б)Б зацвердзіла дырэктыву № 1 «О переходе на подпольную работу парторганизаций районов, занятых врагом», а 1 ліпеня 1941 г. – дырэктыву № 2 «О развертывании партизанской войны в тылу врага» [1, с. 18].

На пяты дзень вайны ЦК ЛКСМБ, не чакаючы ўказанняў партыйных органаў і ЦК ВЛКСМ, прыняў рашэнне аб тым, каб у раёнах, «занятых врагом, комсомольским организациям переходить в подполье, устанавливать тесные связи с партийными организациями и под их руководством применять против фашистских бандитов все методы борьбы» [1, с. 53].

Апарат ЦК ЛКСМБ у Магілёўскай і Віцебскай абласных камсамольскіх арганізацыях праводзіў непасрэдную працу па фарміраванню знішчальных атрадаў і народнага апаўчэння, а таксама інструктажы райкамаў ЛКСМБ па пытаннях пераходу ў падполле. Да падполля рыхтавалася і Гомельская арганізацыя.

Для баявой дзейнасці ў тыле ворага ЦК ЛКСМБ па даручэнню ЦК КП(б) Беларусі ў чэрвені–ліпені 1941 г. у Магілёве падабраў 100 чалавек, у Віцебску – 150 чалавек. У Гомелі з камсамольцаў гэтай вобласці і Палескай было падабрана да 400 чалавек добраахвотнікаў у атрады парашутыстаў [1, с. 55]. У той жа час у заходніх раёнах Беларусі камсамольскія органы былі

застаны вайной нечакана і ў асноўным эвакуіраваліся, не паспеўшы ўтварыць падпольную сетку з ліку маладых людзей.

З дакладной запіскі сакратара ЦК ЛКСМБ М. В. Зімяніна ад 23 ліпеня 1941 г. у Гомелі на імя сакратара ЦК КП(б)Б Г. Б. Эйдзінава аб працы ЦК ЛКСМБ па арганізацыі ўзброенага супраціўлення ворагу ў чэрвені–ліпені 1941 г. бачны не толькі пэўныя поспехі ў арганізацыі гэтай дзейнасці, але і недахопы. У прыватнасці, Зімянін адзначаў, «что в подготовке к подполью в Витебской, Могилевской и здесь – в Гомельской областях в райкомах и обкомах комсомола было и есть еще много беспечности, пренебрежения к технике…Были отдельные факты трусости и дезертирства – ЦК принимал по ним соотвествующие меры» [1, с. 56].

Зразумела, што не толькі камсамольскія органы і арганізацыі не былі падрыхтаваны да разгортвання падпольнага руху на першым этапе вайны, але і партыйна-савецкія органы. У многім гэта тлумачыцца тым, што ў пачатку 1930-х гг., асабліва калі Гітлер прыйшоў да ўлады і стала зразумелым, што Германія нападзе на Савецкі Саюз, савецкая ваенная дактрына прадугледжвала абарончы характар, магчымасць вядзення першапачаткова вайны капіталістычных краін на тэрыторыі СССР. У сувязі з гэтым у Беларусі пад кіраўніцтвам партыйных органаў і Беларускай ваеннай акругі зараней рыхтаваліся да магчымай партызанскай барацьбы з ворагам. У тайне, пад падпіску рыхтавалася законспіраваная сетка дыверсійных груп, вялася падрыхтоўка дыверсантаў-адзіночак у гарадах і на чыгуначных станцыях, манеўраных партызанскіх атрадаў і груп. Кожны з партызан і падпольшчыкаў павінен быў стаць кваліфікаваным разведчыкам, падрыўніком, дыверсантам, валодаць рознымі відамі зброі, мог аказваць пярвічную медыцынскую дапамогу, праводзіць інфармацыйную справу і г. д.

У Беларусі было арганізавана шэсць партызанскіх атрадаў (Бабруйскі, Барысаўскі, Мазырскі, Мінскі, Полацкі, Слуцкі) па 300–500 чалавек кожны. У іх склад уваходзілі члены партыі і камсамола, партыйна-савецкія работнікі, супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Курсы «паляўнічых», «рыбаловаў», «аматараў падарожжа» і інш. узначальвалі асобы, якія мелі вопыт партызанскай барацбы ў Заходняй Беларусі, змагаліся з Франка на баку Народнага фронту у Іспаніі. Гэта К. П. Арлоўскі, С. А. Ваўпшасаў, В. З. Корж, С. А. Макарэвіч, А. М. Рабцэвіч, А. К. Спрогіс. Пад зямлёю ў лясах былі падрыхтаваны сховішчы, шпіталі, склады, майстэрні. Яны былі абсталяваныя ўсім неабходным на выпадак вайны: зброяй, харчаваннем, медыкаментамі, вопраткай… На базах зброі знаходзіліся 50 тыс. вінтовак, 150 ручных куляметаў, шмат патронаў, узрыўчаткі і іншага ўзбраення, боепрыпасаў, амуніцыі [2, с. 413].

Аднак па меры ўмацавання Чырвонай арміі камандным складам і асабліва новымі відамі зброі – танкамі, гарматамі, самалётамі, аўтамабілямі, бронемашынамі – ваенная дакрына змянілася з абарончай на наступальную, планавалася ваяваць на тэрыторыі ворага, калі ён нападзе на СССР. Адсюль

адпала неабходнасць у падрыхтоўцы партызан і падпольшчыкаў. Значная частка з іх, найперш з ліку камандзіраў і ваенных спецыялістаў, была рэпрэсіравана, а тайныя базы разбураны. Існаваў пэўны недавер да гэтых людзей. Вышэйшае кіраўніцтва Савецкага Саюза лічыла, што ў выпадку вайны яны могуць стаць пятай калонай. Непрадбачлівыя дзеянні кіраўніцтва дзяржавы дорага каштавалі грамадству, асабліва ў пачатковы перыяд вайны. Таму ўсё прыходзілася пачынаць спачатку. Практыка і вопыт прыходзілі з часам.

Паступова сталі ўтварацца падпольныя камсамольскія органы і арганізацыі, якія цесна былі звязаны і з партызанскім рухам. Яны працавалі пад кіраўніцтвам партыйных камітэтаў і былі звязаны з Вялікай зямлёй, найперш утвораным Цэнтральным і Беларускім штабамі партызанскага руху, якія знаходзіліся ў Маскве. Усяго ў гады вайны дзейнічала 10 абласных, 206 гарадскіх і раённых падпольных камітэтаў камсамола. Яны аб’ядноўвалі больш за пяць тысяч пярвічных камсамольскіх арганізацый. У іх на ўліку знаходзілася звыш 73 тысяч членаў ЛКСМБ [3, с. 133–134]. Стварэнне кожнага з гэтых органаў было абумоўлена тым становішчам, у якім яны ствараліся і дзейнічалі. Калі абстаноўка не дазваляла іх сфарміраваць, то ў тыл ворага пасылаліся ўпаўнаважаныя ЦК, ці абкамаў ЛКСМБ, якія і выконвалі функцыі камсамольскіх органаў. З другой паловы 1942 г. – на пачатак 1943 г. была завершана ў асноўным арганізацыйная пабудова падпольных камсамольскіх органаў. Дзейнасць камсамола ў тылу ворага пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б ажыццяўляў ЦК ЛКСМБ на чале з М. В. Зімяніным, К. Т. Мазуравым, Ф. А. Сурганавым, С. О. Прытыцкім, А. М. Чэрнікавай. Падпольныя абкамы ЛКСМБ узначальвалі Я. М. Канаплін, Т. М. Стрыжак, В. І. Лузгін, І. А. Матыль, С. І. Пармон, А. Ю. Дзенісевіч, П. М. Машэраў, А. Д. Рудак, І. Е. Палякоў і іншыя [3, с. 30].

Перамогі на фронце, дзейнасць Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху, а таксама падпольных партыйных і камсамольскіх органаў актывізавалі дзейнасць беларускага падполья, актыўнай аператыўнай групай якога былі юнакі і дзяўчаты. У многіх выпадках яны маглі здзейсніць тое, што не змаглі б сталыя людзі. Яны былі рызыкоўнымі, бясстрашнымі, смелымі, мужнымі. З аднаго боку, гэта добра, з другога, не зусім. Ім не хапала, часам, развагі, мудрасці, цярпення, што прыходзіць з вопытам, гадамі. Часам адсюль непапраўныя правалы ў кансператыўнай, баявой дзейнасці, а то і непатрэбныя ахвяры.

Удзельнікі падполля акрамя ранейшых формаў і метадаў дзейнасці сталі прымяняць і новыя: перадачу ў партызанскія атрады патрыятычна настроеных людзей, вядзенне разведвальнай і асабліва дыверсійнай работы. Падпольныя групы дзейнічалі практычна ва ўсіх раёнах рэспублікі. Сваімі дзеяннямі выдзяляліся маладыя падпольшчыкі Віцебска, Гомеля, Ліды, Обаля, Скідзеля, Жлобіна, Оршы і іншых гарадоў, сёлаў і вёсак рэспублікі [2, с. 435–436], больш за 100 мінскіх падпольных арганізацый і груп [4, с. 80].

Актыўна зарэкамендавалі сябе ўдзельнікі Асіповічскага камсамольска-маладзёжнага падполля. Адзін з іх 27-гадовы камсамолец Ф. А. Крыловіч (1916–1959 гг.) ажыццявіў самую буйную наземную транспартную дыверсію

Другой сусветнай вайны. У ноч з 29 на 30 ліпеня 1943 г. ён устанавіў дзве магнітныя міны з гадзіннікавым узрывальнікам у эшалон цыстэрн з бензінам на станцыі Асіповічы. У выніку поўнасцю згарэлі або ўзарваліся 5 паравозаў, 25 цыстэрн з бензінам, 8 цыстэрн з авіяцыйным маслам, 65 вагонаў з боепрыпасамі, 5 танкаў «Тыгр», 3 танкі «Л-10», 7 бронемашын, 12 вагонаў з харчаваннем, вугальны склад, шэраг пабудоў. Загінула 50 чалавек станцыі. За вынік гэтага ўчынка партызанскія кіраўнікі атрымалі ў 1943 г. званне Герояў Савецкага Саюза, а сам Фёдар Крыловіч у 1949 г. быў узнагароджаны ордэнам Леніна [4, с. 98–99; 5, с. 214].

Аб гэтай аперацыі хутка стала вядома ў Маскве і Берліне. Высокую адзнаку гэтай буйнейшай дыверсіі даў начальнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху П. К. Панамарэнка. «Если бы меня спросили, – заявіў ён, – о самой выдающейся операции, совершенной одним человеком, я бы не задумываясь, ответил: уничтожение четырех военных эшелонов на станции Осиповичи… Их взорвал комсомолец Федор Крылович. Эта диверсия разбиралась в немецком Генеральном штабе. Восемь генералов охранной службы были сняты со своих постов, некоторые расстреляны. Следствие сочло их виновными в том, что они не уберегли столь необходимые немецкой армии составы: ведь шли бои на Курской дуге» [6, с. 244].

Актыўна дзейнічалі маладыя падпольшчыкі Мінска. За тры гады Вялікай Айчыннай вайны яны здзейснілі больш за 1500 розных дыверсій у горадзе. Толькі ў лютым–кастрычніку 1943 г. у Мінску было арганізавана 16 камсамольска-маладзёжных падпольных арганізацый. Імі праводзілася актыўная праца сярод юнакоў і дзяўчат па ўцягненню іх у барацьбу з фашысцкімі захопнікамі, распаўсюджвалася інфармацыя пра баявыя дзеянні Чырвонай арміі. Асаблівая ўвага надавалася ажыццяўленню дыверсій. Да прыкладу, 5 сакавіка 1943 г. праведзена дыверсія на чыгунцы, у выніку якой былі спалены тры платформы з бензінам. 8 жніўня гэтага ж года ўзарваны электрамост на заводзе імя Мяснікова. На гэтым жа заводзе ў другі дзень былі ўзарваны 2 катлы качагаркі, у выніку чаго перастаў працаваць паравы молат. Падобныя аперацыі маладыя падпольшчыкі Мінска праводзілі на радыёзаводзе, хлебным заводзе, у чыгуначным дэпо Мінска, авіцыйнай майстэрні, на нямецкіх складах, чыгунцы [7, с. 48–49].

У гады акупацыі добра зарэкамендавала сябе Обальскае камсамольска-маладзёжнае падполле, якое дзейнічала з пачатку 1942 г. да жніўня 1943 г. у Сіроцінскім раёне. У яго склад уваходзіла каля 40 камсамольцаў і маладых людзей з пасёлка Обаль, вёсак Ушалы, Зуі, Масцішча, Ферма. Кіраваў падполлем камітэт камсамола ў складзе Е. С. Зянькова (сакратар), Н. А. Азоліна, М. С. Дзяменцьева, У. І. Езавітаў, І. В. Езавітаў і Я. Я. Езавітаў, М. П. Лузгіна, З. М. Партнова, В. М. Шашкова. Падпольшчыкі займаліся традыцыйнай для падполля справай: распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, перапраўлялі людзей у партызанскія атрады, ажыццяўлялі дыверсіі, збіралі і перапраўлялі зброю для партызан, медыкаменты, разведвальныя даныя і гэтак

далей. Імі была ўчынена 21 дыверсія (спалілі льнозавод, пілараму, электрастанцыю, знішчылі некалькі мастоў і інш.). Па іх звестках, савецкія самалеты знішчылі на чыгуначнай станцыі Обаль 4 эшалоны з танкамі; пасля ўзрыву вадакачкі на гэтай станцыі 11 нямецкіх воінскіх эшалонаў былі затрыманы тут на некалькі дзён [8, с. 351].

Актыўна змагаліся і кіраўнікі ЛКСМ Беларусі. У барацьбе падпольшчыкаў і партызан важнае значэнне меў асабісты фактар, які істотна ўплываў на ход падзей. Гэта добра бачна з наступнага прыкладу. Партызанскія атрады пасля начнога пераходу схавана падыйшлі да добра ахоўваемага мосту на рацэ Пцічы. На світанку завязаўся бой. У нейкі момант штурмаваўшыя завагаліся. Немцы адправіліся ад шоку, наступаўшыя партызаны вымушаны былі падацца назад. У гэты драматычны момант К. Т. Мазураў, сакратар ЦК ЛКСМБ і ўпаўнаважаны БШПР, падняў у атаку аўтаматчыкаў. Агнём падавілі немцаў. Мост быў узарваны. Рашучасць і смеласць К. Т. Мазурава вызначылі вынік боя. За такі подзвіг прадстаўлялі да звання Героя Савецкага Саюза, але В. І. Казлоў парваў ліст на ўзнагароду Мазурава з-за крыўды за крытыку. Аб гэтым перад смерцю прызнаўся Мазураву сам В. І. Казлоў [9, с. 69].

У жорсткай сутычцы з ворагам беларускія патрыёты неслі вялікія страты. У сакавіку–маі 1942 г. былі арыштаваны 404 мінскія падпольшчыкі, з якіх 279 былі расстраляны і павешаны. Новы ўдар па мінскім падполлі быў нанесены ў верасні–кастрычніку 1942 г.: у засценкі гестапа былі кінуты сотні падпольшчыкаў.

У жніўні 1942 г. агенты СД трапілі на след патрыётаў Брэста. Было арыштавана каля 100 чалавек. У снежні 1942 г. такі ж лёс напаткаў многіх патрыётаў Магілёва, Віцебска. Большасць арыштаваных загінулі ў канцлагерах, на шыбеніцах і ў душагубках або расстраляны.

Аднак масавы тэрор і рэпрэсіі не зламалі волю беларускага народа да змагання з фашысцкімі акупантамі. На месца загінуўшых прыходзілі новыя тысячы патрыётаў. Рады партызан і падпольшчыкаў пастаянна пашыраліся, іх барацьба станавілася ўсё больш актыўнай і наносіла захопнікам адчувальныя страты.

Усяго ў патрыятычным падполлі удзельнічала больш за 70 тыс. чалавек. Многія з іх аддалі свае жыцці дзеля сваёй Айчыны, многія дажылі да Перамогі над фашысцкімі захопнікамі, многія ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі за актыўную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі [10, с. 124]. Вечная памяць пра іх гераічныя дзеянні.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Беларусь в первые месяцы Великой Отечественной войны (22 июля – август 1941 г.) : док. и материалы / сост. : В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : НАРБ, 2006. – 458 с.

2. Партызанскі рух у Вялікую Айчынную вайну // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 5. – С. 413–417.

3. **Краўчанка, І. С.** Работа Кампартыі Беларусі ў тылу ворага / І. С. Краўчанка. – Мінск : Акадэмія навук Беларускай ССР, 1959. – 176 с.

4. **Літвін, А.** Акупацыя Беларусі (1941–1944). Пытанні супраціву і калабарацыі / А. Літвін. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2000. – 287 с.

5. **Боярский, В. И.** Партизаны и армия. История утерянных возможностей / В. И. Боярский. – Минск : Харвест, 2003. – 300 с.

6. Беларусь в годы Великой Отечественной войны, 1941–1945 / А. А. Коваленя (рук. авт. кол.) [и др.]. – Минск : Белорусское телеграфное агенство, 2005. – 540 с.

7. **Коваленя, А. А.** Антигерманское сопротивление белорусской молодежи в годы Великой Отечественной войны / А. А. Коваленя // Партизанское движение в Беларуси и его роль в разгроме фашистских захватчиков в 1941–1944 годах : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 25–26 июня 2009 г. – Минск : Беларус. навука, 2009. – С. 37–58.

8. Обальскае камсамольска-маладзёжнае падполье // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 5. – С. 351.

9. **Нордман, Э. Б.** Не стреляйте в партизан… / Э. Б. Нордман. – Минск: Беларусь, 2007. – 200 с.

10. **Каваленя, А. А.** Беларусь напярэдадні і ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войн / А. А. Каваленя, І. А. Саракавік. – Мінск : Беларусь, 2008. – 271 с.